**УДК 821.161.3**

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫЯ РЭАЛІІ Ў РАМАНЕ В. АДАМЧЫКА "ЧУЖАЯ БАЦЬКАЎШЧЫНА"

***Н.Г. АПАНАСОВІЧ***
**Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Разглядаюцца гісторыка-культурныя рэаліі рамана В. Адамчыка "Чужая бацькаўшчына". Асновай твора стала заходнебеларуская рэчаіснасць, на прыкладзе якой празаік паспрабаваў прасачыць жыццёвую абумоўленасць і гістарычную прадвызначанасць лёсу беларусаў. Адзначаецца багатае і рознаўзроўневае ўвядзенне фактаграфічнага матэрыялу, які арганічна ўплецены ў мастацкі аповед і адметна маркіруе і ілюструе прастору, выяўляе спецыфіку псіхалогіі, мыслення вясковага чалавека, акрэслівае яго аксіялагічныя канстанты. Гісторыка-культурныя рэаліі твора (гістарычная і геаграфічная канкрэтыка, сацыяльна-палітычныя ўмовы, эканамічныя пераўтварэнні, адукацыйныя магчымасці, некаторая спецыфіка нацыянальна-рэлігійнага пытання) даследуюцца ў кантэксце часу, у сувязі з ідэйна-мастацкай задумай празаіка. Падкрэсліваецца сувязь найважнейшай для вяскоўцаў праблемы зямлі з духоўна-маральным і этна-нацыянальным. Звяртаецца ўвага на раскрыцці сімвалічнай назвы "Чужая бацькаўшчына" ад агульнага да прыватнага, у працэсе звужаэння кантэксту праблемы ад агульнаграмадскай і дзяржаўнай да прыватнай, уласнай і асабістай.*

**Уводзіны**. Вячаслаў Адамчык увайшоў у гісторыю беларускай літаратуры як удумлівы і тонкі празаік. Амаль у самым пачатку творчага шляху пад час дыскусіі пра шляхі развіцця беларускай літаратуры на пасяджэнні Прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР (19.06.1969) малады аўтар практычна сфармуляваў сваё творчае крэда: "…паказаць жыццё ва ўсёй яго разнастайнасці і шматпланавасці" [1, 3]. Вернасць традыцыям рэалізму, адданасць сваім караням, шчырая павага да "сялянскай" цывілізацыі", глыбокае адчуванне трагічнасці і незваротнасці часу вызначылі мастацка-эстэтычныя пошукі В. Адамчыка на ўсё жыццё.

Адзначаючы несумненны талент празаіка, найвыдатнейшы беларускі пісьменнік І. Мележ у рэцэнзіі-водгуку да зборніка апавяданняў "Дзікі голуб" (пазней была надрукавана ў кнізе "Жыццёвыя клопаты") ахарактарызаваў маладога калегу як аўтара "нялёгкага і няпростага" [2, 393]. Сапраўды, В. Адамчыка можна назваць пісьменнікам, які смела закранаў тэмы складаныя і неадназначныя, пазбягаў прамалінейнасці і адкрытай ацэначнасці. Можа таму творы празаіка неаднаразова крытыкаваліся, выклікалі супрацьлеглыя меркаванні, прымушалі спрачацца і задумвацца.

Неадназначныя ацэнкі крытыкаў атрымаў і першы раман В. Адамчыка "Чужая бацькаўшчына" (1977), які распачаў раманны цыкл ("Год нулявы" (1982), "І скажа той, хто народзіцца" (1987), "Голас крыві брата твайго" (1990), прысвечаны лёсу беларускага народа ў надзвычай складаны жыццёвы перыяд: напярэдадні і напачатку Другой сусветнай вайны.

З аднаго боку твор атрымаў найвышэйшую ацэнку і быў двойчы адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі: Літаратурнай прэміяй імя І. Мележа (1980) і Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Я. Коласа (1988) (разам з раманамі "Год нулявы", "І скажа той, хто народзіцца").

З другога боку, пачынаючы з першай рэцэнзіі на раман "Чужая бацькаўшчына", аўтарам якой стаў беларускі літаратуразнавец А. Рагуля [3], была распачата шматгадовая дыскусія па разуменні і асэнсаванні ідэйна-мастацкай спецыфікі твора, вызначэнні праблемна-тэматычных абсягаў закранутых пытанняў, адметнасцяў мастацкай манеры аўтара.

Адным з праблемных, спрэчных момантаў стала спасціжэнне глыбіні выяўленасці беларускай свядомасці, раскрытай аўтарам на заходнебеларускім матэрыяле. Менавіта рэгіянальны кантэкст, багата напоўнены фактаграфічным зместам, стаў адной з праблем, а часам і своеасаблівай перашкодай у адпаведнай інтэрпрэтацыі твора, аб'ектыўным асэнсаванні аўтарскай задумы.

Так, А. Рагуля, а потым і М. Тычына [4], акцэнтуючы ўвагу на падрабязным бытапісанні ў рамане і звужаючы мастацкі свет твора да адлюстравання вясковага быцця, справакавалі аднабокае тлумачэнне рамана, скіравалі яго разуменне да паказу найперш гістарычнай бесперспектыўнасці вясковага існавання. "Жыццё стала падобным на жыццё ў мяшку, канцы і пачаткі многіх жыхароў Верасава і Дварчан аказаліся страчанымі", – напісаў у сваёй рэцэнзіі А. Рагуля [3, 7]. "Кола жыццёвых інтарэсаў сялян звужана да крайняй ступені: гаспадарчыя клопаты, побытавыя нелады, сямейны дабрабыт, сваркі, плёткі, забабоны… І амаль нічога звыш гэтага…", – заўважаў М. Тычына [4, 175].

Падобнае ўспрыняцце змястоўнага складніку твора надалей стымулявалася і ідэалагічнымі патрабаваннямі, бо бытавое, будзённае, індывідуальна-псіхалагічнае ў ім на ўзроўні сюжэтных перыпетый значна пераважала сацыяльнае, грамадзянскае. У рамане адсутнічаў аповед пра актыўнае супраціўленне і

барацьбу супраць польскага ўціску і асіміляцыйнай палітыкі, не распавядалася і аб дзейнасці рэвалюцыйна-вызваленчых сіл і партый. В.Адамчык збудаваў свой аповед пра цяжкае становішча жыхароў заходнебеларускіх земляў не просталінейна, маніфестацыйна (як гэтага вымагаў стыль сацыялістычнага рэалізму), а раскрыў "сацыяльнае аблічча паказанай ім рэчаіснасці знутры, праз побыт, маральна няўстойлівую, духоўна глухую і скалечаную будзённасць" [5, 240].

Сапраўды, раман ствараўся В. Адамчыкам у савецкі час і аўтар не мог не ўлічваць кан'юнктурных запатрабаванняў, але, магчыма, дзякуючы багатай фактаграфічнасці, удумліваму выбару народазнаўчага матэрыялу, таленавітаму ўвасабленню яго ў мастацкай прасторы, пісьменнік не толькі змог пазбегнуць заідэалагізаванасці твора, але і здолеў закрануць, прадставіць чытачам адну з найбольш складаных, спрэчных і балючых для беларускай гісторыі старонак жыцця Заходняй Беларусі. Паспрабаваў зрабіць гэта, на колькі можна было ў сямідзясятыя, як мага больш праўдзіва і аб'ектыўна, надалей паступова ад рамана да рамана пашыраючы і паглыбляючы кола пытанняў (ад адлюстравання эканамічнага становішча, асіміляцыйнай палітыкі польскага ўрада, да праблем ўсведамлення "сваё" і "чужое", выяўлення супярэчнасцяў партызанскай барацьбы на заходнебеларускіх землях, з'явы калабарацыі і інш), якія і да сённяшняга дня маюць неадназначныя ацэнкі, недастаткова разгледжаны і асэнсаваны, з'яўляюцца "праблемнымі" і патрабуюць перагляду з пазіцый сучаснай гісторыяграфіі і мастацтвазнаўства не толькі ў Беларусі, але і з польскага боку. Адзін з аўтарытэтных даследчыкаў заходнебеларускай праблематыкі А. Вабішчэвіч адзначае: "У цэлым, разгорнуты ў 1990-я гг. дыялог беларускай і польскай гістарычных навук патрабуе на сучасным этапе істотнага ажыўлення, змястоўнага напаўнення, узаемапаважлівага стаўлення і збліжэння канцэптуальных падыходаў" [6, 79].

**Асноўная частка**. Асновай рамана "Чужая бацькаўшчына" стала перадваенная заходнебеларуская рэчаіснасць, "ажыўленая" побытавымі падрабязнасцямі вясковага ўкладу, этнаграфічнымі замалёўкамі, уважлівым адлюстраваннем псіхалогіі сялянскага быцця, праўдзівым пазначэннем каштоўнасных і светапоглядных арыенціраў жыхароў "усходніх крэсаў". Характарызуючы ўвесь цыкл раманаў В.Адамчыка, В. Каваленка заўважае: "…многае ўлоўлена да дробязей, дакладнасць такая, што здаецца, і змяніць нічога нельга, каб не парушылася аўтарская канцэпцыя народнай гісторыі, канцэпцыя вобраза свядомага беларуса ў той гістарычны час" [7, 533]. Можна з упэўненасцю канстатаваць, што багаты фактаграфічны матэрыял не проста спрыяў стварэнню сапраўды рэалістычнага малюнка вясковага жыцця, а дапамог аўтару дасягнуць эфекту "поўнага пагружэння" ва ўздзеянні на чытача, дазволіў стварыць "магчымасць абагульнення самога тыпу беларускай свядомасці на пэўным этапе гістарычнага існавання народа" [7, 532].

Многія сучасныя даследчыкі (Г.Тычко, В.Бароўка, Н.Дамброўская і інш.) разглядаюць рэгіянальны кантэкст твора, багатую палітру бытапісальніцтва як каштоўную крыніцу па вывучэнні народазнаўства, мэтанакіраваную праекцыю да агульнанароднага, дзейсны сродак пазнання беларускага характару, культуры, побыту, актуалізаваных эпохай глабалізацыі, сучаснымі пагрозамі нацыянальна-культурнай уніфікацыі. Аднак, як слушна канстатуе ў сваім даследаванні В.Бароўка: "…увага айчыннай прозы да нацыянальных культурна-гістарычных рэалій і этнааксіялагічных канстант пакуль не стала прадметам сістэмнага навуковага даследавання" [8, 4].

Спробу разгледзець ідэйна-тэматычную прастору рамана "Чужая бацькаўшчына" на шырокім гісторыка-культурным фоне, з прыцягненнем архіўных матэрыялаў здзейсніў аўтар першай манаграфіі пра творчасць В. Адамчыка Я. Лецка [9, 10], але яму ў сваіх даследаваннях не ўдалося пазбегнуць пэўнай заангажаванасці, звязанай з ідэалагічнымі патрабаваннямі савецкага часу. Падкрэсліваючы важнасць ведання гісторыка-культурных рэалій часу для асэнсвання рамана, літаратуразнавец найбольшую ўвагу засяродзіў на творчай эвалюцыі празаіка, разгледзеў сістэму персанажаў, жанрава-стылістычныя асаблівасці твора ў кантэксце сусветнай літаратурнай традыцыі, шмат палемізаваў з папярэднімі даследаваннямі.

Вывучэнне рамана паводле асобных аспектаў народазнаўчай праблематыкі пачалося фактычна толькі ў сучасным літаратуразнаўстве. Так, Г. Тычко акцэнтавала ўвагу на спецыфіцы тыпалагізаванасці і мастацкім падыходзе В. Адамчыка да адбору і асэнсавання фактаграфічнага матэрыялу [11]; М. Тычына асэнсоўваў вытокі, эвалюцыю, спецыфіку вобразнага свету беларускага пісьменніка [12]. В. Бароўка засяродзілася на разглядзе творчай спадчыны В.Адамчыка з пазіцый мастацкага народазнаўства, адметнасцей мастацкага этнграфізму і рэгіянальна-абласнога кантэксту твораў [8]. Н. Дамброўская сканцэнтравала ўвагу на жанрава-стылёвай спецыфіцы прозы, ролі аўтабіяграфізму, асаблівасцях псіхалагізму, спалучэнні лірычнага і філасофскага пачаткаў [13]. Адметную і каларытную моўную стыхію, насычаную дыялектызмамі, трапнымі народнымі выслоўямі даследавала А.С. Васілеўская [14] і інш.

Нягледзячы на align рознапланавыя падыходы да вывучэння творчасці В.Адамчыка, застаецца, на наш погляд, незаўважаным адлюстраванне спецыфічна мясцовага, побытавага свету ў рамане. Гісторыка-культурны фон з'яўляецца найважнейшым складнікам твора з пазіцыі і падыходаў самога аўтара, надзвычайна ўважлівага да "будзённых" падрабязнасцяў і гістарычнай праўды. Цікавым гэты аспект прадстаўляецца ў сувязі з нацыянальным, агульначалавечым, як адна з магчымасцяў, выяўленых у XX ста-

годдзі "школой исторической длительности", прасачыць адлюстраванне сусветнай, еўрапейскай гісторыі ў "люстэрку" маленькай, канкрэтнай тэрыторыі. У дадзеным даследаванні робіцца спроба разгледзець гісторыка-культурныя рэаліі (гістарычную і геаграфічную канкрэтыку, сацыяльна-палітычныя ўмовы, эканамічныя пераўтварэнні, адукацыйныя магчымасці, некаторыю спецыфіку нацыянальна-рэлігійнага пытання) ў рамане ў кантэксце часу, у сувязі з ідэйна-мастацкай задумай празаіка.

Выхадзец з "крэсаў усходніх", В. Адамчык абраў для свайго першага рамана вясковую заходнебеларускую рэчаіснасць, якую добра ведаў, глыбока разумеў і шанаваў. Адчуванне адказанасці за захаванне свайго, роднага, абвостранае адчуванне незваротнасці часу падштурхоўвалі да ўважлівай і карпатлівай працы раманіста: "Як шкадую, ажно да шчымлівага болю, што не магу прачытаць кніжку пра людзей сваёй зямлі. Ёсць, вядома, "Пан Тадэвуш", "Новая зямля", але гэта чамусьці не суцяшае" [15, 176]. Праз усю творчасць В. Адамчык імкнуўся увасобіць і захаваць памяць пра гісторыю сваёй зямлі, роду, сям'і, вывесці гэты свет не толькі на абсягі нацыянальнай літаратуры, але і на сусветны ўзровень.

В. Адамчык па-майстэрску ўважліва, дэталёва, шматгранна ўзнавіў жыццё заходнебеларускай вёскі і яе жыхароў напярэдадні Другой сусветнай вайны. Г. Тычко адзначае: "Каларытны і непаўторны свет сялянскага побыту ў рамане "Чужая бацькаўшчына" ўзноўлены В. Адамчыкам да дробязяў" [11, 195]. Сапраўды, пісьменнік імкнуўся стварыць па мастацку аналітычную, шматпланавую і шматгранную панараму народнага жыцця.

Быційная прастора ў рамане прадстаўлена з розных бакоў на розных узроўнях: побытавым, сацыяльным, палітычным, прыродна-геаграфічным, моўным, этнагарафічным, псіхалагічным, аксіялагічным, рэлігійным і інш. Пры гэтым, такое багатае і рознаўзроўневае ўвядзенне фактаграфічнага матэрыялу не стала самамэтай аўтара. Усе рэаліі арганічна ўплецены ў мастацкі аповед, адметна маркіруюць і ілюструюць прастору, выяўляюць спецыфіку псіхалогіі, мыслення вясковага чалавека, акрэсліваюць яго аксіялагічныя канстанты.

Раман "Чужая бацькаўшчына" В.Адамчык пачынае з дакладнага пазначэння мастацкага часу: "Быў лістапад, было святога Міхала" [16, 4]. З першых радкоў аўтар пагружае чытачоў не толькі ў часавую канктрэтыку, а ўводзіць у прастору каляндарнай цыклічнасці і традыцыйнай арганізаванасці сялянскага жыцця.

Міхайлаў дзень – быў апошнім святам года, адзначаўся 21 лістапада. Толькі да гэтага дня пастухі выганялі кароў ў поле [17, 181]. Народная традыцыя з Міхалам звязвала і прыроднае пацяпленне - "Міхайлаўскія адлігі", чытаем пра гэта і ў В.Адамчыка: "..блізілася пара зімы, а ў гэты год стаяла цяпло. Павярнуўшыся з полудня, павільгатнеў вецер, памякчэла пад нагамі зямля..." [16, 4].

З першых радкоў аўтар з'ядноўвае каляндарна-абрадавую ды прыродную прастору міфалагічнага светаўспрымання і ўладкаванасць сялянскага жыцця, скіроўвае нас на разуменне арганічнай непарыўнасці гэтай сувязі. Дзень "Святога Міхала" сімвалічна завяршае працоўны год, імкне да завяршэння каляндарнага цыклу: "людзі ўпраўляліся да зімы. Мянялася квадра месяца – чакаліся халады" [16, 5]. Сюжэтная лінія праходзіць праз найбольш важныя і вызначальныя моманты паўгадавога народнага светапогляднага кола: з Міхалавага дня аповед доўжыцца праз "ціхую і трывожную набожнасць" [16, 294] у падрыхтоўцы да каляднай куцці, пасля якой паступова "зіма павярнулася на вясну" [16, 351] пасля Грамніц і надыйшла пара капаць мел, каб пабяліць хаты да Вялікадня [16,398]. Фінальныя падзеі адбываюцца ў Ведравічах, дзе "за высокім рэдзенькім частаколам свяцілася пабеленая, з блакітнымі вокнамі хата" [16, 485] і заканчваюцца паслявелікоднымі майскімі днямі. Яшчэ ў Верасаве, перад самым ад'ездам ў Ведравічы на хрэсьбіны, стары Корсак, зачараваны веснавой прыгажосцю грушы-дзічкі, якая міжволі напомніла яму пра памерлую каханую жонку, "…прыпыніўся, загледзеўшыся на маладую ўшчэпу і на раннюю, што не праспала першага маёвага дня, быструю пташачку" [16, 478]. Народны каляндар гэта не толькі святы, але і пэўны сімвал. Пережылі зіму - пережылі благое. Надыход вясны, чаканне Вялікадня на фоне ўсіх тых сюжэтных калізій, трагедыі чалавечага лёсу, якія разгрываюцца на апошніх старонках рамана, напаўняюцца верай ў будучыню, надзеяй на лепшае.

Такім чынам, гістарычны час раману "Чужая бацькаўшчына" можна акрэсліць лістападам 1938 г. і майскімі днямі 1939г. Канкрэтызуе часавыя межы В. Адамчык і праз фактаграфічныя звесткі, якія ўводзіць апасродкавана, ненавязліва праз рэальны гістарычны кантэкст. Разам з тым, аўтар нібы падкрэслівае разумную цікавасць і пэўную дасведчанасць вясковых мужчын ў палітыцы, іх сур'ёзную зацікаўленасць ва ўсім, што магло паўплываць на жыццё. Так, адсылкі да сапраўдных гістарычных падзей, якія канкрэтызуюць часавую прастору аповеду, змяшчаюцца ў газетах, выпісаных з Вільні і набытых Міцем Корсакам у Дварчанах. У канцы рамана з публікацый вяскоўцы даведаліся, што італьянцы занялі Албанію [16, 375], "..нямцэ занялі Чэхаславакію" [16, 372]. Удакладненнем фактаграфіі сталі загалоўкі, прачытаныя Міцем па просьбе вяскоўцаў: "Чэхі і маравы заняты праз Гітлера", "Чэхі падаліся без аднаго стрэлу", "Венгры займаюць Падкарпацкую русь", "Валошын ўцёк да Румыніі" [16, 375]

Суадносна з гістарычнымі дадзенымі пазначаныя пераўтварэнні сапраўды адбыліся ў сакавіку-красавіку 1939 года [18, 22–24].

Цэнтральным месцам падзей стала Верасава. Гэта вёска не вызначалася нейкім надзвычайным становішчам, не была асаблівай, а трапіла ў поле зроку пісьменніка хутчэй за сваю тыповасць, падабенства да многіх іншых заходнебеларускіх вёсак. Разам з тым, праз упэўненае сцверджанне дварчанскага ксяндза: "Знам, знам, то весь піякув і зладзеюв, мейсцовэ яндро цемносці" [16, 285], – В. Адамчык паказаў прадузятыя адносіны да заходнебеларускіх земляў з польскага боку. На ўсіх узроўнях рамана беларускі аўтар імкнуся да аб'ектыўнасці, праўдзівасці, мэтанакіравана пазбягаў адкрытай ацэначнасці, правакаваў чытача на крытычнае стаўленне да аповеду, да самастойнага асэнсавання мастацкага зместу. "В.Адамчык імкнецца да максімальнай гістарычнай дакладнасці, да таго, каб факты асабістых успамінаў не засланілі сапраўднага народнага жыцця ў рамане. З вялікай колькасці жыццёвых з'яў ён выбірае толькі тыя, якія можна назваць тыповымі, якія маглі адбывацца ў любой беларускай вёсцы…" [11, 209].

Геаграфія рамана "Чужая бацькаўшчына" ахоплівае тэрыторыю Наваградскага ваяводства. Мастацкая прастора твора сканцэнтравана ў Дварчанах, сапраўдным цэнтры вясковага жыцця, а таксама жыцця размешчаных вакол яго найбліжэйшых вёсак. За вёрст пяць ад яго знаходзілася Верасава, праз раку ад якога размешчаліся Прылуцкія хутары. Упамінаюцца Лязневічы, "што былі вярсты за тры на ўсход сонца ад Верасава" [16, 66]. Сюжэтная лінія заводзіць у Ведравічы, маленькую вёсачку хат на трыццаць, куды адправіліся Корсакі да сваіх родных на хрэсбіны і дзе так нечакана змянілася жыццё галоўнай гераіні Алесі. Распавядаецца і пра жыхароў Дубатоўкаў, самай блізкай да Дварчан вёскі. Праз лёсы вёсак і іх жыхароў В.Адамчык як бы незаўважна, але мэтанакіравана выводзіць дзеянне рамана на прастору заходнебеларускага краю, нібы апасродкавана акрэслівае кола найбольш спрэчных і "балючых" для жыхароў "крэсаў усходніх" эканамічных праблем.

Так, аповед пра лёс Дубатоўкаў раскрывае пытанне, звязанае з фактам будаўніцтва чыгункі, якое адбылося "гадоў пяцьдзясят таму". У выніку будаўнічых работ "казна адабрала палавіну лепшае дубатоўскае зямлі" [16, 147]. Законных выплат за зямлю дубатоўцы так і не атрымалі ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі: "спачатку прыйшлі немцы, потым палякі". З гэтай прычыны найбольшая частка насельніцтва вёскі збяднела і не змагла вярнуцца да ранейшага ладу жыцця, што ў сваю чаргу прывяло да катастрафічных перамен: "Цяпер яны жылі са станцыі – кралі, што нарвецца пад руку…Валаклі ўсё, бо ведалі, што ўсё прыдасца ў гаспадарцы. А найбольш пільнаваліся падахвотнае работы…" [16, 147].

Праз гістарычны кантэкст В.Адамчык імкнецца адшукаць перадумовы і прычыны пераўтварэнняў у светапоглядзе і псіхалогіі вясковага чалавека, прасачыць нараджэнне комлексу "пакрыўджаных" і "абрабаваных", які вядзе то да бязвольнага падначальвання любому загаду, то нараджае агрэсію і жорсткасць. Так, асабліва прадузята дубатоўцы адносіліся да ведраўцаў. Нянавісць перадавалася спадчынна, бо на яе мелася прычына, звязаная з ранейшым пазелам зямлі. "Завініліся яны даўно, яшчэ за сервітута – кутка пашы, які ніяк не маглі раздзяліць: дубатоўцы згубілі свой межавы план" [16, 147]. Гаворка ідзе пра аграрную рэформу, праводзімую польскімі ўладамі і на "крэсах усходніх ", звязаную ў тым ліку з перажыткамі сервітутнага права. У міжваеннай Польшчы сервітуты існавалі толькі ў той частцы, якая раней уваходзіла ў склад Расійскай імперыі. У Заходняй Беларусі сервітутныя землі былі замацаваны яшчэ царскімі ўладамі спецыяльнымі граматамі, якія захоўваліся ў давераных асоб і з цягам часу губляліся, таму афіцыйных дакументаў на права карыстання гэтымі землямі ў сялян часта не было. Для вяскоўцаў быў важны кожны кавалак зямлі, таму праблема прыналежнасці гэтых земляў стаяла заўсёды востра [19, 129–131].

Пытанні аграрных пераўтварэнняў В. Адамчык закранае неаднаразова, падкрэсліваючы неадназначнасць рэформ для заходнебеларускіх жыхароў. Гаворыць пра гэта, распавядаючы пра небяспечны начлег і выпас коней ведраўскімі жыхарамі ў Лязневічах. Паколькі там былі яшчэ не скасаваны шнуры, а "вялікі палетак жыта межаваў з верасаўскімі дзялкамі", то верасаўцы "ўвосень, калі на лезнявецкім полі паднімалася рунь, зноў пачыналі пускаць на яе кароў і авечак" [16, 66]. Парушальнікам была вядома леташняя трагедыя верасаўскага пастушка, якога абязвечыў і выбіў вока бізуном наняты на ахову поля лезнявецкі паплаўнічы, але, нават пры небяспецы, яны не маглі адмовіцца ад звычнага і пераўтварэнні прымалі пад прымусам. Зямельная рэформа, нягледзячы на прагрэсіўны характар, "адначасова садзейнічала яшчэ большаму сацыяльнаму размежаванню заходнебеларускай вёскі, умацаванню акупацыйнай палітыкі" [19, 165].

Дварчаны В. Адамчык паказвае як сапраўдны цэнтр вясковага жыцця, у якім размяшчаліся гміна і пастарунак – органы мясцовага кіравання і падтрымання парадку на ўсёй прылеглай да мястэчка тэрыторыі. На заходнебеларускіх землях "быў уведзены прыняты ў Польшчы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел – ваяводствы, паветы, гміны" [20, 214].

Эканамічнай магістраллю была чыгунка, якая не толькі абслугоўвала прамыслова-гаспадарчыя патрэбы краю, але і была важнай крыніцай прыбыткаў вясковых жыхароў. Станцыя і пакгаўз – прэс-

тыжнае месца працаўладкавання, нягледзячы на цяжкую, а часам і небяспечную работу. У Дварчанах знаходзіліся пошта, школа, аптэка, "жыдоўскія" крамы. Духоўна-рэлігійная пастора адлюстроўвала спецыфіку краю. У Дварчанах меліся і царква, і касцёл.

Найважнейшай зімовай падзеяй быў кірмаш, на якім збіраліся на брукаваны пляц ў Дварчаны жыхары найбліжэйшых вёсак. Там прадавалі "лішкі", якіх не было, набывалі тое, што раней рабілі самі, а цяпер па матэрыялы прыходзілася ездзіць ў далёкае Восека, у стары казённы лес. Астатняе прыходзілася набываць на грошы, здабытыя ад продажу жыта ды іншых запасаў. Найперш найбольш важныя і патрэбныя ў гаспадарцы: газу, запалкі, соль. Гэтыя жыццёванеабходныя і хадавыя тавары каштавалі дорага, а часам і самі станавіліся сродкам разліку. Так, найміты за малацьбу запрасілі ў гаспадыні Алесі "два злоты і кіля солі". Разлік быў не танным, але ў гаспадарцы, дзе не было мужчын, надзея была толькі на падобную дапамогу.

Узгадванне рэальных беларускіх гарадоў і мястэчак В. Адамчык ўводзіць для пашырэння і канкрэтызацыі гістарычнага фону, паглыблення ў спецыфіку заходнебеларускага жыцця, межавага маркіравання рэгіёну. Узгадаваюцца сапраўдныя заходнебеларускія мястэчкі: Пінск, Наваградак. Чэся распавядае пра сваю вучобу ў школе пеленягрэк у Баранавічах. Барысаў, Слонім, Шчучын, вёскі Паніква і Зэмбін з'яўляюцца ва ўспамінах Ваўчка пра неўдалую добраахвотную службу ў войску польскім: " Паляке вернуліся назад. Я, ужо ачуняўшы ад хваробы, паехаў у Слонім, там і знайшоў свой полк. Трохі паслужыў і думаю сабе-падамся на афіцэра. Адправілі мяне ў падафіцэрскую школу. Скончыў яе, а звання мне не даюць. Эге, бачу тут нешта не тое. Бачу, не туды палез…" [16, 337–338].

Аповед пра бацькоў і дзяцінства Імполя закранае трагічную гісторыю пра лёсы многіх бежанцаў, якія вымушаны былі пакінуць родныя мясціны праз вайну. Першымі адчулі небяспеку і памкнуліся ў выгнанне "мазуры", жыхары Сувалак. Спроба бацькоў Імполя наладзіць жыццё ў эвакуацыі за Самарай, у горадзе Бугуруслане, дзе ўсё было незнаёмым, нязвыклым, чужым: "людзі, іхняя гутарка і нават адзежа" [16, 47], не ўдалася. Мінск, праз які пазней прайшла мяжа, стаў перавалачным пунктам, "надзеяй на выратаванне", спачатку пры адпраўцы, а потым вяртанні з эвакуацыі спакутаваных і згаладалых беларускіх бежанцаў: "Змучаныя, знэнджаныя дарогаю людзі сцякаліся ў Мінск – тут іх ужо садзілі на поезд" [16, 47], "Бежанцы хлынулі назад, дадому – у той год якраз скончылася вайна і каля Мінска ўстала новая граніца" [16, 47-48].

Пашыраюць геаграфічныя і часава-прасторавыя абсягі мастацкай прасторы і звесткі аб працоўнай эміграцыі беларускага насельніцтва больш позняга, мірнага часу. Перанаселенасць "усходніх крэсаў", збяднеласць і павелічэнне беспрацоўя вымагалі беларусаў шукаць іншай долі за межамі Польшчы, а польскім уладам вырашаць праз эміграцыйны паток эканамічныя праблемы. "У пошуках працы і хлеба сяляне-беднякі ехалі на каменнавугальныя шахты Францыі, плантацыі Аргенціны, Бразіліі, ЗША" [21, 376]. Для беларусаў, як правіла, гэта быў вымушаны выезд на заробкі ад безвыходнасці і немагчымасці іншым спосабам паправіць сваё матэрыяльнае становішча. Эміграцыйныя заробкі былі нялёгкімі і няпростымі, таму верасаўцы выязджалі толькі з вострай неабходнасці. Напрыклад, Шайбакова Кася збіралася адправіцца на сезонныя работы ў Латвію: "ёй выйсця не было: у бацькі адна пад адною пяцёра дзяўчат" і "усе на выданне"[16, 317].

Паездка магла закончыцца фатальна (Сцяпан Чарняўскі з Амерыкі да сваёй сям'і не вярнуўся [16, 83]), і наадварот, прынесці жаданы вынік, які збіраўся па саломінцы і каштаваў здароўя: багацце, дваццаць гекатараў ужо растрэсенай панскай зямлі, набытай старым Радзюком на заробленыя за пяць гадоў у капальнях Францыі грошы" [16, 54]. Кожны гістарычны факт у творы не проста фон, на якім адбываецца дзеянне і разгортваецца сюжэт, а выхад на канкрэтны чалавечы лёс. Чаму так здарылася, што такім чынам здабытая заможнасць не прынесла шчасця? Грошы не дапамаглі выратаваць хворага сына, а спадчына павінна была перайсці да нявартай нявесткі? Можа таму, што была набыта не проста зямля, а "растрэсеная", значыць парцэляваная, якая магла быць і прымусова прададзеная?

Праз такія аповеды В. Адамчык імкнуўся асэнсаваць абумоўленасць чалавечых лёсаў жыццёвымі абставінамі, прасачыць іх уплыў на светаўспрыманне, характар і псіхалогію жыхароў "крэсаў". Разнастайныя факты эканамічнага жыцця, закранутыя ў рамане, сталі спробай разгледзець праблему сялянскага дабрабыту з розных бакоў, як мага больш аб'ектыўна, аналітычна, з пазіцыі гістарычнай праўды. В.Адамчык закцэнтаваў увагу на абсалютнай і натуральнай залежнасці спакойнага, перспектыўнага жыцця вясковага чалавека ад зямельнага ўладання і разам з тым падкрэсліў трагізм становішча вяскоўцаў.

Выразнымі маркерамі заходнебеларускай рэчаснасці выступаюць у рамане з'явы і паняцці, якімі рэгуляваліся сацыяльна-палітычныя і дзяржаўна-грамадзянскія адносіны. Так, праблемамі афіцыйнага ўладкавання сялянскага жыцця, вырашэннем спрэчных пытанняў, захаваннем закону, наглядам і падтрыманнем парадку на ўсёй тэрыторыі Польшчы , у тым ліку і на " крэсах усходніх" займаўся солтыс – вясковы стараста. Солтысы павінны былі быць сувязным звяном у сістэме ўлады грамады: з аднаго боку, ім патрэбна было праводзіць дзяржаўную палітыку сярод насельніцтва, з другога – патрэбы мясцовых

жыхароў перадаваць «наверх» [22, 25,]. У Верасаве гэту пасаду займаў Янка Вайтовіч. Да яго звярталаяся Лезнявецкая жанчына са скаргай і падазрэннем на крадзёж палатна верасаўскімі мужчынамі. Вайтовіч, як і ўсе верасаўцы, тушыў пажар і дапамагаў ратаваць дабро сям'і Міронавых. Для стварэння завяшчання на спадчынную перадачу зямлі вяскоўцы павінны былі зваць солтыса і сведку. Такі "testament" і склаў Вайтовіч, у прысутнасці Літавара, па запрашэнні Алесі Мондрай [16, 224].

Два класы адукацыі Вайтовіча (у параўнанні з чатырма Літавара і законачанай сямігодкай ў Міці Корсака), могуць ілюстраваць рэальную праблему, з якой сутыкаліся польскія ўлады пры распрацоўцы патрабаванняў для кандыдатаў на пасаду солтыса. Адной з умоў выбрання, адпаведна распараджэння міністра ўнутраных спраў ад 23 кастрычніка 1933 г., якое дапаўняла закон «Аб частковым змяненні арганізацыі тэрытарыяльнага самакіравання» ад 23 сакавіка 1933 г., было абавязковае валоданне вуснай і пісьмовай польскай мовай. Але пазней дзеянне гэтага палажэння было адкладзена на ўсходніх землях на 5 гадоў, а потым, у адпаведных ваяводствах увогуле было адменена, у сувязі з тым, што і праз больш чым 15 гадовы тэрмін існавання міжваеннай Польшчы, польскім уладам цяжка было знайсці на ўсходніх крэсах кандыдатаў з адапаведным валоданнем польскай мовай [22, 24-25].

Вайтовіча як солтыса слухаліся, ён быў у пэўнай ступені паважаны аднавяскоўцамі. Для стварэння праўдзівага вобраза вясковага старасты, паказу сапраўдных адносін да гэтай пасады з боку самога абранага і падначаленых яму жыхароў вёскі, В.Адамчык, распавядаючы пра малапаважаны род Рэпкаў, робіць невялікую заўвагу пра перыяд, калі солтысаву пасаду займаў бацька братоў Рэпкаў, Адам Рэпка. Ён "шчыра прыслужваў" палякам, бо моцна зайздросціў працавітым і больш старанным аднавяскоўцам і выдаў тых, хто не даў рэквізаваць сваю скаціну. Так, у Лявона Шайбака забралі для польскага войска астатнюю карову, а стары Корсак быў моцна збіты: "За ўтойванне палякі моцна каралі мясцовых жыхароў: так быў да паўсмерці збіты Корсак, за жарабіцу, якую ён схаваў, перагарадзіўшы хлеў яшчэ адной глухой сцяною" [16, 39]. У адрозненне ад Рэпкі, Вайтовіч не дазваляў сабе самаўpraўства, сачыў за выкананнем законных патрабаванняў.

Выконваючы загады войта, які непасрэдна кіраваў дзейнасцю солтыса [22, 25], ён прыносіў вяскоўцам павесткі. Міцю Корсаку належала прыйсці ў пастарунак, а верасаўскім рэзервістам падрыхтавацца да мабілізацыі: "У войска прызываліся пяцёра верасаўскіх рэзервістаў" [16, 383]. Вайтовіч, адпаведна "росказу" войта, арганізаваў вяскоўцаў на загатоўку леса для будаўніцтва маста, якая закончылася трагедыяй – смерцю Мацюшкі Бортніка.

Яго слухаліся як прадстаўніка ўлады, і разам з тым адносіліся з пэўнай доляй скептыцызму, разумеючы, што солтыс толькі на словах клапоціцца аб дабрабыце і правах аднавяскоўцаў. Пры складанні тэстамента ўпэўненае Вайтовічава: "Я хачу як найлепш" [16, 224], не супакоіла трывогу старой Мондрыхі. Солтыс нават не паспрабаваў расследаваць ні крадзёж палатна, ні смерць Тэквілі і Еўкі Мондрых, ды і правы пагарэльцаў наўрад ці будзе абараняць.

Спыняецца В.Адамчык і яшчэ на адной з'яве, характэрнай выключна для заходнебеларускай рэчаіснасці міжваеннага часу: асадніцтве. "Асаднікі павінны былі стаць тым элементам польскай палітыкі, які павінен быў правесці на акупаваных землях шэраг пераўтварэнняў, каб канчаткова ліквідаваць адрозненне гэтай тэрыторыі ад карэннай Польшчы" [19, 158]. І да гэтай, відавочна адмоўнай для беларусаў з'явы, В. Адамчык падыходзіць з намерам максімальнай дакладнасці і аб'ектыўнасці, распавядаючы пра розных прадстаўнікоў роду Грабянкаў, старэйшы з якіх быў асаднікам. Сям'я Грабянкаў паказвалася не толькі праз дабрабыт, які складаўся з гумна, стайняў, мураванага атынкаванага дому, "што хаваўся па вокны ў кучаравым садку", не толькі праз паводзіны і адносіны прадстаўнікоў асадніцкай сям'і паміж сабой і да наймітаў, але праз погляд саміх верасаўцаў, якія наймаліся да іх на заробкі, карысталіся млыном. Заможнасць і статус вылучалі асаднікаву сям'ю не толькі матэрыяльна, але адбіваліся на знешнім выглядзе (дагледжанасць, добрае моднае адзенне), прыязных, клапатлівых адносінах паміж сямейнікамі, імкненнем і магчымасцю набыць адукацыю г.д. Напаўнялася флёрам арыстакратызму асадніцтва і ва ўспрыняцці сялян. Вытанчанасць, пэўная далікатнасць, адукаванасць, паказальна паважлівыя адносіны да больш нізкіх па сацыяльным статусе сялян для Алесі Мондрай, як магчыма і для іншых жней, здаваліся прыметамі сапраўднай шляхецкасці, нетутэйшага, зайздроснага жыцця. "Алесі здавалася, што ў асадзе было нейкае іншае ад верасаўскага, пекнае, вясёлае жыццё" [16, 185]. Паступова "працверазеўшы" ад таемнай захопленасці асадніцкім сынам Франакам, Алеся пазбавілася і ад рамантычнага погляду на асаднікаў, разам з ёю пазбавіліся ад такога ўспрыняцця чытачы.

Неаднаразова звяртаўся В. Адамчык да праблемы асветы, найперш да праблем школьнай адукацыі. Вучоба ў "паўшэхнай" школе прадугледжвала сем класаў. Нягледзячы на тое, што адукаванасць была ў вясковага насельніцтва ў пашане, беднякі мелі мала шанцаў атрымаць адукацыю. Дазволіць сабе навучанне маглі больш-менш заможныя сяляне, якія разумелі неабходнасць вучобы, марачы аб лепшай долі, падтрымлівалі ў імкненні вучыцца сваіх дзяцей. Так, стары Корсак, пасля таго як воўк напалохаў сына па дарозе ў школу, зняў Міцю пакой у Дварчанах."Ён пайшоў тады ў пяты клас дварчанскай школы – адзін з усяго Верасава: яго равеснікі, каму перакінулася за дванаццаць,…браліся за плуг" [16, 105]. Сярод



Polotsk SU

шчаслiўчыкаў-навучэнцаў былі як разумныя, здольныя і зацікаўленыя вучні (такія як Міця, Чэся), так і няздольныя, але зацікаўленыя ў адукацыі як ў статуснай з'яве дзеці заможных гаспадароў (Ладак Радзюк, Костак Камашыла). Працягваць вучобу далей, пасля сямігодкі, маглі сабе дазволіць адзінкі, і то, толькі пры адпаведных матэрыяльных магчымасцях. Так, бацька Костака Камашылы, якога ніхто за добрага вучня не лічыў, вымушаны будзе аплочваць сыну прэстыжны працяг вучобы ў Віленскай гімназіі: "А за якія кошты? Цяпер мне як вытрываць – выкінь штогод дзвесце злотых" [16, 416].

Нацыянальна-рэлігійны склад насельніцтва заходніх земляў шматнацыянальны і прадстаўлены ў творы беларусамі, палякамі, яўрэямі і татарамі, рэлігійная прастора – праваслаўнымі ("рускімі") і каталікамі. Пры гэтым, В.Адамчык як бы наўмысна не завастраў увагу на нацыянальнай прыналежаці сваіх персанажаў; з другога боку паслядоўна прасочваў залежнасць правоў, магчымасцыяў, дабрабыту і роду заняткаў ад нацыянальнай прыналежнасці. Так, гандлярамі і ўтрымальнікамі разнастайных крамаў у большасці былі яўрэі, колькасць якіх перад пачаткам другой сусветнай вайны пачала павялічвацца: "Вой, ці чулі? У Дварчаны з Нямеччыны жыдэ наехалі. ..Хіба не чула, што нямцэ іх выбіваюць?"[16, 335]. Гістарычна склалася, што "ў гарадах і мястэчках пануючыя пазіцыі ў гандлі займалі яўрэі" [20, 356].

Паказальна шматнацыянальны склад штатных працаўнікоў дварчанскай станцыі і сіндыката: двое татараў, дварчанскі паляк Вунгер, дубатоўскі Платон Верамей, верасаўскі Сяргей Рэпка.

Асаблівую ўвагу В.Адамчык звяртаў на складанасці пытання нацыянальнай вызначанасці беларусаў, спрабаваў разгледзець яго з розных бакоў: з пазіцыі жыццёвых перспектыў, рэлігійнай прыналежнасці, свабоды выяўлення і г.д. Так, упэўненыя ў тым, што Беларусь "наверсе не была і ніколі не будзе" [16, 114], паліцэйскія палякі Бубель і Гура моцна збілі ў пастарунку за беларускамоўныя вершы і спадзяванні "адшукаць Беларусь" Міцю Корсака. Сітуацыя жыццёвай бесперспектыўнасці, немагчымасць наладзіць спакойнае заможнае жыццё, разуменне практычнай бессэнсоўнасці змагання за лепшую долю нарадзіла ў саміх беларусаў комплекс непаўнаваратсці: "Во так і кажуць, што беларус не раўня паляку і немцу. – бо і нераўня…" [16, 97]. Пытанне нацыянальнага самавызначэння на заходнебеларускіх землях В.Адамчык бачыў моцна звязаным з праблемай веравызнання: калі хрышчаны ў касцёле-значыць паляк. Характэрны ў гэтым сэнсе дыялог Ваўчка з Міцем Корсакам: "Я то во - паляк… Які ж вы, дзядзька, паляк?... Як і ты – у касцёле хрышчаны. Ды і назвіска мае польскае – Ваўчок. –Па-польску было б Вільчэк… " [16, 334]. Разам з тым, спроба Ваўчка зрабіць ваенную кар'еру, пасля добраахвотнага ўдзелу ў вайсковых дзеяннях на баку палякаў, стала выразнай ілюстрацыяй немагчымасці пераадолець нацыянальныя абмежаванні, змяніць наканаванае. У шчырай гаворцы чалавека, які на ўласным вопыце паспрабаваў наладзіць іншае жыццё, Ваўчка з маладым, яшчэ апантаным надзеяй на перспектывы, Міцем Косакам, акрэсліліся шляхі да лепшай долі: "Хто ж цябе, мужыка, пусціць? Ты павінен век, як твае дзяды і прадзеды, быць пад нечаю пятою. Нявучаны чалавек – сляпы. Яго трэба за руку вадзіць – сам ён дарогі не знойдзе… Вот чаму мы не ведаем –хто мы. Адзін кажа – паляк, другі кажа-беларус.. Ды і галодныя мы, нам яшчэ наесціся хочацца. І свянцонага зелля, каб трохі душы апячы… Каб злосць прагнаць…" [16, 337]. Упэнена, і разам з тым далікатна і сур'ёзна, праз развагі сваіх персанажаў В.Адамчык і сам выяўляў тыя неабходныя і абавязковыя ўмовы, якія б вярнулі беларуса да самога сябе і дапамаглі здабыць лепшую долю, гэта – свабоднае і самастойнае жыццё, асвета і адукацыя, а таксама найважнейшыя складнікі: свая зямля і вера.

**Заключэнне**. Заходнебеларуская рэчаіснасць, якая стала асновай рамана "Чужая бацькаўшчына" прадстаўлена на розных узроўнях. Выяўлены гісторыка-культурны кантэкст характарызуе аўтара як глыбока дасведчанага і абазнанага ў прадмеце свайго аповеду. Скрупулёзна падабраныя шматлікія факты рэчаіснасці арганічна ўплеценыя ў прастору аповеду, сталі асновай для раскрыцця закранутых праблем, дазволілі асэнсаваць і лёс асобнага чалавека і гісторыю народа на шырокім фоне гісторыка-культурнага кантэксту, весці аповед з пазіцый рэалізму. Адным з найважнейшых складнікаў мастацкай прасторы твора сталі шматлікія гісторыка – культурныя рэаліі, праз якія дэталёва, праўдзіва і падрабязна раскрыта жыццё заходнебеларускай вёскі. Геаграфія аповеду і выразныя часавыя паказальнікі канкрэтызавалі аповед, далі магчымасць закрануць максімальна аб'ектыўна і поўна ўвесь спектр заходнебеларускіх праблем. Уключанасць і залежнасць жыцця заходнебеларускага рэгіёна, "крэсаў усходніх" ад Польскай дзяржавы выразна маркіравана ў аповедзе праз пазначэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, прадстаўнікоў органаў улады і парадку, зямельна-маёмасных пытанняў і інш. Зямельнае пытанне, як найважнейшая ўмова сялянскага дабрабыту, разгледжана ў кантэксце праводзімых польскімі ўладамі аграрных рэформ. Лёс беларусаў выяўляецца на фоне шматнацыянальнасці насельніцтва заходнебеларускіх земляў, з улікам гістарычнай прадвызначанасці. Аўтар паспрабаваў выявіць і прасачыць жыццёвую абумоўленасць спецыфікі светапогляду, асаблівасцей характару і паводзін вясковага чалавека, адшукаць карані нацыянальнай абыякавасці і інэртнасці. Шматзначнасць сімвалічнай назвы рамана "Чужая бацькаўшчына" раскрываецца ад агульнага да прыватага, звужаючы кантэкст праблемы ад агульнаграмадскай і дзяржаўнай да прыватнай, уласнай і асабістай, ад агульнадзаржаўнага асэнсавання месца і статусу "крэсаў усходніх" як праблемы "ні свае, ні чужыя" ў Польскай дзяржаве, да прыватнага пытання, арганічнай прадвызначанасці сялянскага жыцця уласнасцю на зямлю. Праблему Зямлі, сваёй,

бацькоўскай, спадчыннай, чужой, набытай і г.д.. В.Адамчык звязаў з духоўна-маральным і этна-нацыянальным. "У традыцыйнай плыні сямейна-бытавога рамана падспудна пульсуе і час ад часу выбіваецца на паверхню спакутаваная народная думка: "Хто мы? Куды ідзем? І што нас чакае наперадзе?" [23,7] Праз фактаграфічны фон пісьменнік не толькі прасачыў жыццёвую прадвызначанасць, але і пазначыў, паспрабаваў разгледзець гістарычныя перспектывы лёсу беларусаў.

ЛІТАРАТУРА


1. Жанру апавядання – увагу і падтрымку. [З пасяджэння прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР] // Літаратура і мастацтва. – 1969. – 27 чэрв. – С. 1–3.
2. Мележ, І. Жыццёвыя клопаты. Літаратурная крытыка, публіцыстыка / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1975. – 608 с.
3. Рагуля, А. Людзі на раздарожжы / А. Рагуля // Літаратура і мастацтва. – 1977. – 10 чэрв. – С. 7.
4. Тычына, М. З думкаю пра народ / М.Тычына // Маладосць. – 1979. – №4 – С. 174–177.
5. Каваленка, В. Самі сабе чужыя/ В.Каваленка // Полымя. – 1972.- №1. – С.239-245
6. Вабішчэвіч, А. Гісторыя і культура Заходняй Беларусі і Ўсходняй Літвы (паўночна-усходніх зямель ІІ Рэчы Паспалітай) у сучаснай беларускай і польскай гістарыяграфіі / А.Вабішчэвіч // Studia Białorutenistyczne / Instytut Filologii Słowiańskiej UMCS Zakład Białorutenistyki. – 2013. – №7. – С. 73–80.
7. Каваленка, В.А. Вячаслаў Адамчык / В.А.Каваленка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Аддзяленне гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я.Купалы ; навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – Мінск : Бел. навука, 2002. – Т. 4., Кн. 1. 1966–1985. – 928 с.
8. Бароўка, В.Ю. Мастацкае народазнаўства ў беларускай літаратуры ХХ стагоддзя (на матэрыяле прозы) : манаграфія / В.Ю.Бароўка. – Віцебск : ВДУ імя Машэрава, 2009. – 212 с.
9. Лецка, Я.Р. Хараство і боль жыцця: Нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка / Я.Р. Лецка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 128с.
10. Лецка, Я. Зрухі жыцця і літаратуры. Творчы партрэт Вячаслава Адамчыка (заканчэнне) / Я. Лецка // Дзеяслоў.– 2011. – №3 (52). – травень-чэрвень. – С. 292–315.
11. Тычко, Г.К. Беларуская літаратура ХІХ-ХХ стагоддзяў: час і асобы : вуч. дапаможнік / Г.К. Тычко. – Мінск : Беларускі дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – 267с.
12. Тычына, М.А. Развітанне з сялянскай Атлантыдай. Вобразны свет Вячаслава Адамчыка / М.А. Тычына // Роднае слова. – 2003. – № 8. – С. 4–8.
13. Дамброўская, Н.М. Проза Вячаслава Адамчыка: родава-жанравы і стылявы аспекты : манаграфія. / Н.М. Дамброўская. – Брэст : Альтэрнатыва, 2009. – 182с.
14. Васілеўская, А.С. Функцыянальна-стылістынае выкарыстанне лексічных вобразных сродкаў у мастацкай прозе : аўтарэф. дыс. .... канд. філ. навук : 10.02.01. / А.С. Васілеўская ; БДПУ імя М.Танка. – Мінск, 2000 – 21с.
15. Адамчык, В. На крыллях смутку і адзіноты / В. Адамчык // Маладосць. – 1993. – № 10. – С. 115–177.
16. Адамчык, В. Чужая бацькаўшчына.раман / В. Адамчык. – Мінск : Папуры, 2015. – 511 с.
17. Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад.: А.Ю.Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.
18. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) : учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высш. образования / А.А. Коваленя [и др.] ; под ред. А.А. Ковалени. – Минск : Изд. центр БГУ, 2004. – 278 с.
19. Грэсь, С.М. Аграрныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. : манаграфія / С.М. Грэсь. – Гродна : ГрДМУ, 2012. – 204с.
20. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М.П.Касцюк [і інш.] ; Ін-т гісторыі АНБ. – Мінск : Беларусь, 1995. – Ч. 2. – 560с.
21. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал. М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : Совр. шк.: Экаперспектыва, 2007–2011. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1946 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2007. – 613 с.
22. Борка, А.І. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : манаграфія / А.И. Борка. – Гродна : ГрДУ, 2011. – 139 с.
23. Тычка, Г. На неспазнаны круг жыцця… / Г. Тычка // Літаратура і мастацтва. – 1988. – 28 кастр. – С. 6–7.


## THE HISTORICAL AND CULTURE-SPECIFIC CONCEPTS IN THE NOVEL ‘STRANGE HOMELAND’ BY V. ADAMCHYK

*N. APANASOVICH*

*The article deals with the historical and culture-specific concepts in the novel ‘Strange Homeland’ by V. Adamchyk. The work is based on the western Belarusian reality where the writer tried to trace causality of life and historical predetermination of Belarussian people’s fate. The attention is paid to the high and multilevel introduction of the factual material which is woven into the narration and adds the remarkable peculiarities to the space representation. Moreover, it reveals the specifics of the villagers’ way of thinking and determines axiological constants. The historical and culture-specific concepts in the novel (historical and geographical particularities, social and political conditions, economic reforms, educational opportunities, the particularities of the national and religious question) are analyzed through the time background due to the ideological and artistic conception of the writer. The bond between the main for villagers land issue and the moral and ethno-national issues are emphasized. The attention is drawn to the disclosure of the symbolic title ‘Strange Homeland’ from the general to the particular in the process of narrowing the context of the problem from public to private and and personal.*